ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (769) • Пятніца, 3 красавіка 1970 г. Цана 2 кап. • Год выдання XXIII



Арганізавана і на высокім узроўні прайшоў Ленінскі залік на другім курсе факультэта журналістыкі. Кожны камсамолец трымаў строгі адказ перад таварышамі за свае справы і учынкі.

На здымку: «за» галасуе сакратар камсамольскай арганізацыі курса Віктар Аўчарэнка. Не супраць і члены камісіі.

Фота А. ЛАСМІНСКАГА.

## АДКРЫЎСЯ НОВЫ ФАКУЛЬТЭТ

Усё нарастаючы паток тэхнічнай інфармацыі, бурны рост вылічальнай тэхнікі, шырокая аўтаматызацыя упраўлення патрабуюць падрыхтоўкі вялікага атрада спецыялістаў у галіне прыкладной матэматыкі.

З 1 красавіка ў нашым універсітэце адкрыўся новы факультэт — прыкладной матэматыкі.

Падрыхтоўка спецыялістаў будзе весціся па наступных спецыяльнасцях: матэматычнае забеспячэнне электронных вылічальных машын; прымяненне сродкаў вылічальнай тэхнікі; матэматычнае забеспячэнне аўтаматычных сістэм упраўлення. Да гэтага часу спецыялізацыя падобнага роду вялася толькі ў чатырох універсітэтах краіны — Ленінградскім, Казанскім, Кіеўскім і Ерэванскім.

У 1970 годзе студэнтамі факультэта прыкладной матэматыкі стануць 150 першакурснікаў, прычым прыём іх будзе праводзіцца па самастойнаму конкурсу.

## ПАСЛЯ СПРАВАЗДАЧ І ВЫБАРАЎ

У сакавіку 1970 года ў сістэме органаў народнага кантролю БДУ праведзены справаздачна-выбарныя сходы. Яны прайшлі на высокім арганізацыйным і палітычным узроўні.

Старшынямі факультэцкіх груп выбраны Н. Н. Хаўратовіч (фізфак), М. В. Кніга (хімфак), А. І. Сцефановіч (біяфак), І А. Прусаў (матфак), О. А. Пруднічэнка (юрфак), М. Ф. Піліпенка (гістфак), С. В. Драко (геафак), А. Г. Слука (факультэт журналістыкі), В. А. Захарава (філфак), Т. І. Ліпніцкая (падрыхтоўчы факультэт), У. Д. Мухаеў (адміністрацыйна-гаспадарчая частка), П. М. Бараноўскі (выдавецтва). Усяго ў факультэцкія групы народнага кантролю выбрана 182 чалавекі.

18 сакавіка адбылася універсітэцкая справаздачная канферэнцыя, на якой выбрана універсітэцкая група народнага кантролю. У яе саставе 47 чалавек. Старшынёй ГНК БДУ выбран Е. Н. Тагуноў, намеснікам старшыні Е. А. Акінчыц.

27 сакавіка адбылося першае пасяджэнне універсітэцкай групы народнага кантролю, на якім зацверджан план работы, вырашаны арганізацыйныя пытанні.

У саставе ГНК БДУ арганізавана 7 сектараў: арганізацыйнай работы (кіраўнік — Е. А. Акінчыц), па разгляду заяў і скарг і удасканаленню работы упраўленчага апарату (кіраўнік — В. А. Раманенка), па ахове сацыялістычнай уласнасці (кіраўнік — В. М. Сітнікаў), навуковай работы (кіраўнік — А. В. Юхневіч), вучэбнай работы (кіраўнік — Г. А. Лазерка), па кантролю за капітальным будаўніцтвам (кіраўнік — І. З. Собалеў) і сектар быту.

Е. АКІНЧЫЦ.

## ПАРТЫЙНАЕ ДАРУЧЭННЕ ДЫСЦЫПЛІНУЕ

Статут КПСС абавязвае кожнага члена партыі актыўна удзельнічаць у палітычным жыцці краіны, у кіраванні дзяржаўнымі справамі, у гаспадарчым і культурным будаўніцтве, паказваць прыклады ў выкананні грамадскага доўгу, дапамагаць развіццю і умацаванню камуністычных і грамадскіх адносін.

Спашлюся на практыку, якая склалася ў нашай партарганізацыі. Перш за усё мы адрозніваем пастаянныя даручэнні — прапагандыст, куратар, член камітэта камсамола, сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта, курса, рэдактар газеты і г. д. і разавыя — падрыхтоўка пытання на партсходзе, удзел у рабоце той ці іншай камісіі, выступленне з дакладам на партсходзе і г. д. Усе камуністы маюць партыйныя даручэнні.

Звычайна новавыбранае партбюро, зыходзячы з практычных заўваг, выказаных камуністамі на справаздачна-выбарным партыйным сходзе, імкнецца прыцягнуць да актыўнай работы усіх камуністаў, вызначыць найбольш падыходзячае заданне кожнаму. Як правіла, калі камуністу даецца новае даручэнне, то яго запрашаюць на партбюро. Загадзя з гэтым камуністам гутарыць член партбюро.

Часам мы сустракаем цяжкасці, звязаныя з падборам партдаручэння таму ці іншаму камуністу. Так, напрыклад, паступіла на І курс Марыя Бурдун—кандыдат у члены КПСС. Мы яе не ведалі. Як быць у такім выпадку? Звычайна даземся, як вучыўся камуніст, калі і што закончыў, якія грамадскія даручэнні выконваў. Усё гэта высвятляецца шляхам асабістай гутаркі сакратара або намесніка. І, нарэшце, прапануем камуністу некалькі даручэнняў. Такім чынам, ён мае выбар. Затым даручэнне замацоўваецца за камуністам рашэннем партбюро з абавязковай яго прысутнасцю на пасяджэнні.

Як мы паступілі з Марыяй Бурдун? Па яе жаданню даручылі ёй быць адказнай за правядзенне палітінфармацыі на курсе. Пасля Марыя арганізавала падпіску сярод сваіх аднакурснікаў. І калі паўстала пытанне на камітэце камсамола аб дачы ёй рэкамендацыі, то было прынята аднадушнае рашэнне даць рэкамендацыю М. Бурдун для ўступлення у члены КПСС.

Або узяць другі прыклад. Камуніст Аляксандр Жук прыйшоў да нас на факультэт пасля службы ў пагранічных войсках. З першага курса і па сённяшні дзень вядзе даволі значную грамадскую работу. На працягу трох гадоў ён узначальваў у партбюро сектар абаронна-спартыўнай работы, другі год узначальвае студэнцкае прафсаюзнае бюро факультэта. Гэта ідэйна загартаваны камуніст з высокай камуністычнай свядомасцю. І вучобе Аляксандр Жук удзяляе дастаткова часу. Гэту сесію ён здаў толькі на выдатна.

Але часам бывае і так. Паступіў на факультэт Мікалай Астрэйка. Адслужыў армію з добрай характарыстыкай. У першы год вучобы камуніст Астрэйка узначальваў камсамольскую арганізацыю курса. З гэтай работай спраўляўся нядрэнна. У мінулым годзе М. Астрэйка звярнуўся ў партбюро з просьбай даць яму такое даручэнне, якое менш адымала б часу. Улічваючы тое, што школу ён закончыў да арміі і яму сапраўды цяжкавата раўняцца са сваімі сакурснікамі, партбюро задаволіла просьбу камуніста М. Астрэйкі. Яго назначылі адказным за выпуск «Камсамольскага пражэктара». Але Астрэйку нібы падмянілі. Да партыйнага даручэння ён аднёсся з халадком, і, прама скажам, у вучобе асаблівых перамен у параўнанні з мінулым годам не відаць. Партбюро было вымушана указаць М. Астрэйку на яго непартыйныя адносіны да вучобы і даручэнняў.

А вось другі прыклад абыякавага выканання партыйнага даручэння. Аспіранту кафедры біяхіміі і біяфізікі жывёл і чалавека Філімонаву было даручана дапамагаць рэдкалегіі газеты «Віта». І што атрымалася? Камуніст Філімонаў нават не захацеў прысутнічаць на пасяджэнні рэдкалегіі. Матэрыялы, якія было даручана яму рыхтаваць, былі або негатовыя, або недапрацаваныя. Партбюро неаднаразова выклікала камуніста Філімонава і указвала не непартыйныя адносіны да справы, аднак гэта не паслужыла урокам. У выніку камуністу Філімонаву была аб'яўлена вымова.

Кантроль за выкананнем партыйных даручэнняў здзяйсняецца і шляхам справаздачы камуністаў на партбюро і на партыйных сходах. Калі справаздачы на бюро заслухоўваюцца рэгулярна, то справаздачы на партсходах мы усё яшчэ ставім рэдка, за што і падвяргалася партбюро крытыцы на справаздачна-выбарным сходзе.

Грамадскую работу на факультэце вядуць не толькі камуністы. Да яе прыцягнуты амаль увесь прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнты. Аднак многія супрацоўнікі факультэта парой не ведаюць, якую грамадскую работу вядзе той ці іншы іх калега. Відавочна, тут партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі недастаткова зладжана арганізуюць галоснасць гэтай работы, што, безумоўна, зніжае выхаваўчую ролю грамадскіх даручэнняў. Таму неабходна ў самы бліжэйшы час партыйным і прафсаюзным бюро арганізаваць шырокую інфармацыю аб выкананні грамадскіх даручэнняў нашымі лепшымі актывістамі.

Відаць, патрэбна прадумаць і заахвочванне лепшых актывістаў у маштабе факультэта і універсітэта ў цэлым. Рашэнні аб узнагароджанні граматамі, аб падзяках і іншых відах заахвочвання лепшых актывістаў павінны даводзіцца да ведама на адкрытых партсходах, пашыраных пасяджэннях і г. д.

У насценных газетах і шматтыражцы неабходна мець рубрыкі, прысвечаныя актывістам, і цёпла расказваць аб супрацоўніках і студэнтах, якія паўсядзённа удзельнічаюць у грамадскай рабоце. Гэта, безумоўна, станоўча уплывала б на грамадскую актыўнасць усяго нашага калектыву.

А. ШУКАНАЎ,
сакратар партбюро біялагічнага факультэта.



На кафедры фізікі паўправаднікоў распрацавана ўстаноўка для вымярэння тэмпературных залежнасцей электрафізічных параметраў паўправаднікоў і тонкіх плёнак.

Вялікая навукова-даследчая работа, якая праводзіцца на кафедры, і творчае супрацоўніцтва з вытворчасцю стварылі спрыяльныя умовы для рэалізацыі навуковага пошуку. Устаноўка ужо стала вядомай за межамі Беларусі. Адзін з экземпляраў набыў Сібірскі фізіка-тэхнічны інстытут імя Кузняцова. На днях другі экземпляр адпраўлен на ВДНГ СССР, дзе ён будзе дэманстравацца ў павільёне «Асвета».

На здымку: (злева направа) галоўны інжынер праблемнай лабараторыі паўправадніковай тэхнікі В. І. Урэнёў, аспірант кафедры радыётэхнікі і фізічнай электронікі Э. Е. Радоўскі і старшы тэхнік Р. Ш. Рудзіцкі ля новай устаноўкі.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

## СЁННЯ НА АГІТПУНКЦЕ

Ва універсітэце пачалася падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Савет СССР. У корпусе біялагічнага факультэта 27 сакавіка адкрыўся агітпункт. На сходзе агітатараў загадчык кафедры тэорыі дзяржавы і права дацэнт А. Ц. Лейзераў прачытаў даклад на тэму «Савецкая выбарчая сістэма і маючыя адбыцца выбары ў Вярхоўны Савет СССР.

Цяпер на агітпункце да выбараў рыхтуецца спецыяльны стэнд, наладжана дзяжурства студэнтаў і выкладчыкаў біялагічнага, хімічнага, геаграфічнага і матэматычнага факультэтаў, праводзіцца растлумачальная работа аб савецкай выбарчай сістэме, рыхтуюцца спісы выбаршчыкаў.

В. РАДКЕВІЧ.



**На здымку:** Наталля Леанідаўна **Пятрова** вядзе заняткі па англійскай мове са студэнтамі-вячэрнікамі першага курса аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта.

Фота **Д. Чаховіча.**

# ЖЫВАЯ СПРАВА І ФАРМАЛІЗМ

Здаецца, зусім нядаўна рад камсамольскіх арганізацый краіны выступіу з ініцыятывай правядзення Ленінскага заліку. І вось ужо камсамольцы універсітэта даюць справаздачу аб тым, як асабіста яны сустракаюць знамянальны юбілей.

Там, дзе да здачы Ленінскага заліку адкесліся як да жывой, кроўнай справы кожнага камсамольца, пануе прыузнятая, хвалюючая атмасфера, відавочна высокая актыунасць студэнтау. Спецыяльныя камісіі, створаныя з ліку выкладчыкау і камсамольскага актыву, узмацняюць важнасць гэтай палітычнай кампаніі. Але бываюць выпадкі, калі камісія прадстаулена адной асобай—куратарам.

Гэта насцярожвае. Як правіла, здача Ленінскага заліку у такіх групах ператвараецца у нейкае прахадное мерапрыемства.

Трэцякурснікам факультэта журналістыкі, прама скажам, пашанцавала. Аутарытэтная камісія, аутарытэтны яе старшыня — доктар гістарычных навук, прафесар А. Я. Журау. Прыемна было камсамольцам прымаць віншаванні пасля здачы заліку ад прафесара, члена КПСС, аутара кніг аб камсамоліі. І заувагі, выказаныя старшынёй камісіі у адрас некаторых камсамольцау, былі асабліва важкімі.

Зачытваецца характарыстыка камсамолкі Б. Пасля раду станоучых рыс—непрыемны штрых: «малаініцыятыуная». Здавалася б, ці мала іх — малаініцыятыуных —ёсць на сённяшні дзень! Але старшыня камісіі звяртае асаблівую увагу на гэта.

Пасля кароткай размовы стала зразумела, што гэта не выпадковы штрых, што пасіунасць у грамадскіх справах камсамолкі мае прамую сувязь з яе пасіунасцю у практычнай рабоце як будучага журналіста. Своечасова зробленыя заувагі старэйшага таварыша прымусілі дзяучыну сур'ёзна задумацца над адным азначэннем са сваёй характарыстыкі.

Дарэчы, пра характарыстыкі. На жаль, у большасці іх многа фармалізму, штампу, малагаворачых азначэнняу. Вось узоры: «маральна устойлівы», «палітычна пісьменны», «пастаянна павышае свой культурны узровень» і г. д. І гэта пішацца аб маладых людзях з рознымі характарамі, звычкамі, густамі.

Калі падобнае было зачытана аб камсамольцу Валерыю Соліне, сакратар камітэта камсамола факультэта журналістыкі Екель не вытрымау і выступіу. Ён сказау усяго некалькі слоу, прывёу усяго толькі адзін прыклад, які датычыцца Валерыя, якога ён добра ведае, і усім стала зразумела, наколькі багацейшы, цікавейшы гэты студэнт за бяздушную схему з характарыстыкі.

Многа спрэчак, меркаванняў выклікала тое, якія абавязацельствы павінны прыняць камсамольцы. Некаторыя камсамольскія сакратары пайшлі шляхам найменшага супраціулення. Прапаноўвае такі дзеяч узяць камсамольцу абавязацельствы. «А якія!» — пытае той. Тут і растлумачыць бы таварышу усю важнасць прымаемых абавязацельствау, высветліць здольнасці камсамольца, прадаставіць яму, нарэшце, магчымасць для асабістай ініцыятывы. Але камсамольцу проста падсоуваюць абавязацельствы, якія ўжо узяу яго сакурснік, і той спакойна пад капірку спісвае чужыя абавязацельствы.

Так фармалізм, нежаданне праявіць ініцыятыву псуе жывую справу. Вось камсамолец прымае абавязацельства прыняць удзел у двухгодцы «Камсамол—сельскай школе». У чым жа выяуляецца гэты удзел у большасці студэнтау! Гэта або некалькі прынесеных кніг для сельскай школьнай бібліятэкі, або здача грошай [1 рубель] на іх набыццё. І усё. А чаму б не сабрацца камсамольцам і усёй групай выехаць за горад у бліжэйшую вясковую школу, правесці там нядзельнік, падрыхтаваць наглядныя дапаможнікі для школьных кабінетау, даць канцэрт, прачытаць лекцыю, расказаць вучням аб сваёй будучай прафесіі!

Але выбіраецца шлях прасцейшы, прымаецца, адкрыта кажучы, абывацельскае рашэнне. Тут немалая віна кладзецца на камітэты камсамола факультэтау, якія прызваны каардынаваць дзеянні камсамольцау у рашэнні дабратворнай задачы.

Многія камсамольцы абавязаліся дасканала вывучыць той ці іншы твор У. І. Леніна. Большасць з гонарам выканала гэтае абавязацельства. Але уся бяда у тым, што за аб'ект вывучэння бяруцца творы, якія ужо вывучаліся ст[у]дэнтамі па праграме гісторыі партыі. І высакародныя імкненні ператвараюцца часта у фікцыю, у механічнае паутарэнне ужо пройдзенага, вывучанага.

...Камсамолец здае Ленінскі залік, ён трымае своеасаблівы экзамен перад таварышамі, перад камсамолам, перад Леніным. Трэба, каб гэтая кроуная справа кожнага члена ВЛКСМ не пакрывалася налётам фармалізму, пасіунасці, не ператваралася у чарговае мерапрыемства.

У рашэннях раду абласных камсамольскіх канферэнцый краіны ёсць пажаданне зрабіць Ленінскі залік штогадовым. [У] свеце гэтага заувагі, выказаныя вышэй, набываюць асаблівы сэнс.

**В. ШАРШОЎ,**
**студэнт III курса.**
**журфака.**

# ВОПЫТ, ДАСТОЙНЫ ПЕРАЙМАННЯ

Група афіцэрау ваеннай кафедры нашага універсітэта выязджала у Ленінград, каб азнаёміцца з арганізацыяй ваенна-патрыятычнага выхавання і абаронна-масавай работы у Ленінградскім дзяржауным універсітэце імя А. А. Жданава і Вышэйшым камандным артылерыйскім вучылішчы імя Чырвонага Кастрычніка.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі гэтых старэйшых у краіне вучэбных устаноу за апошнія гады накапілі вялікі, цікавы вопыт ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі. Гэта работа носіць сістэматычны, мэтанакіраваны характар.

Арганізацыйнае кіраўніцтва комплексам героіка-патрыятычных мерапрыемствау ва універсітэце здзяйсняецца партыйным камітэтам праз ваенную кафедру, кафедру фізічнага выхавання, кафедры грамадскіх навук, камітэт ВЛКСМ, камітэт ДТСААФ, спартыуны клуб, бібліятэкі, рэдакцыю універсітэцкай газеты, савет ветэранау, агульнауніверсітэцкі штаб паходау «Дарогамі славы», факультэцкія штабы паходау і саветы ветэранау, саветы пакояу баявой славы.

Кіруючым цэнтрам актыву па ваенна-патрыятычнаму выхаванню і абаронна-масавай рабоце з'яуляюцца створаныя тры гады назад штабы паходау «Дарогамі славы» (начальнік штаба генерал-маёр артылерыі у адстауцы І. П. Кныш) і савет ветэранау універсітэта. Штаб паходау працуе у цесным кантакце з саветам ветэранау. Штомесячна штаб аналізуе вынікі работы факультэтау, аказвае дапамогу факультэцкім штабам. У саставе штаба 33 члены — прадстаунікі факультэцкіх штабау, кафедр прафесарска-выкладчыцкага саставу, былых удзельнікау Вялікай Айчыннай вайны. Штаб мае тры сектары: прапаганды і агітацыі, арганізацыйны, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. На факультэтах створаны факультэцкія штабы з прадстаунікоу камсамольскіх, прафсаюзных, фізкультурных, турысцкіх арганізацый, ветэранау рэвалюцыі і вайны, прадстаунікоу камітэта ДТСААФ.

Мэта паходау — патрыятычнае выхаванне студэнцтва на рэвалюцыйных, баявых і працоуных традыцыях савецкага народа, развіццё у юнакоу і дзяучат якасцей стойкага барацьбіта за камунізм, актыунае фарміраванне у маладых людзей пачуцця гордасці і глыбокай павагі да рэвалюцыйнай, працоунай і ратнай славы старэйшых пакаленняу.

Асноунымі напрамкамі паходау з'яуляюцца:

— вывучэнне і прапаганда сярод студэнтау значэння перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, барацьбы народа за Савецкую уладу у гады грамадзянскай вайны, гераічных подзвігау савецкага народа у гады Вялікай Айчыннай вайны;

— правядзенне у час паходау, экскурсій і падарожжау грамадска карыснай работы па выяуленню імён невядомых герояу, студэнтау, супрацоунікау і выкладчыкау універсітэта, загінуушых у гады Вялікай Айчыннай вайны, адкрыццё на факультэтах пакояу, куткоу рэвалюцыйнай, баявой і працоунай славы, збор матэрыялау для іх афармлення, стварэнне летапісау рэвалюцыйных, баявых і працоуных традыцый факультэтау, універсітэта, устаноука памятных дошак на факультэтах і абеліскау на месцах важнейшых рэвалюцыйных, баявых падзей, аднауленне і упарадкаванне магіл загінуушых, арганізацыя сустрэч з ветэранамі рэвалюцыі, войн, былымі партызанамі і воінамі праслауленых злучэнняу і часцей, перадавікамі вытворчасці, дзеячамі літаратуры і мастацтва, запіс успамінау.

Лепшыя удзельнікі паходау узнагароджваюцца ганаровымі граматамі камсамола, памятнымі вымпеламі, каштоунымі падарункамі.

Усю работу савет ветэранау праводзіць на грамадскіх пачатках. Састау савета — 20—25 чалавек. Сюды уваходзяць прадстаунікі факультэтау, агульнауніверсітэцкіх кафедр, служб і грамадскіх арганізацый. Рабочая група савета складаецца са старшыні, яго наменікау па ідэалагічных, арганізацыйных пытаннях і сакратара. Кожны намеснік мае сваю рабочую групу з 3—5 чалавек.

На факультэтах, агульнауніверсітэцкіх кафедрах, у аддзелах створаны секцыі савета у саставе 3—5 чалавек. Секцыю узначальвае адзін з членау савета. Секцыя вядзе улік ветэранау вайны і накіроувае іх дзейнасць адпаведна плану работы савета.

Савет збіраецца два разы у год, у пачатку кожнага семестра, каб разгледзець планы работы і абмеркаваць практычныя пытанні, звязаныя з агітацыйна-прапагандысцкай дзейнасцю ветэранау. Штогод у чэрвені месяцы праводзяцца выбары савета.

Вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню праводзіць генерал-маер артылерыі у адстауцы Іван Паулавіч Кныш, ганаровы грамадзянін горада Гатчына. Ветэраны рэвалюцыі, вайны і працы разам з моладдзю удзельнічаюць у паходах і экскурсіях, тэматычных канферэнцыях, разам з камсамольцамі ствараюць фонд на адкрыццё мемарыяльных дошак памяці студэнтау, аспірантау, выкладчыкау і супрацоунікау, загінуушых на франтах вайны. На аснове сабраных матэрыялау ва універсітэце хутка будзе створан музей баявой і працоунай славы, складзен зборнік успамінау «Студэнты і выкладчыкі Ленінградскага універсітэта на абароне Радзімы».

У цяперашні час праводзіцца масавы паход камсамольцау і моладзі па ленінскіх месцах, месцах баёу, сустрэчы з ветэранамі партыі. Вялікая увага удзяляецца аваладанню моладдзю ваенна-тэхнічнымі ведамі.

Шырокае далучэнне камсамольцау да сістэматычных заняткау у абаронна-масавых гуртках, правядзенне ваенна-спартыуных спаборніцтвау, арганізацыя палітыка-масавай работы у ваенна-спартыуных лагерах — такія формы абаронна-масавай работы у Ленінградскім дзяржауным універсітэце.

Традыцыйнымі тут сталі лыжныя спаборніцтвы памяці студэнта філасофскага факультэта, камандзіра універсітэцкага лыжнага партызанскага атрада Віктара Дарафеева, гераічна загінуушага у 1941 годзе, лёгкаатлетычныя эстафеты памяці бессмяротнага подзвігу студэнта-гісторыка Вячаслава Васількоускага, закрыушага 6 снежня 1941 года сваім целам амбразуру дота у бітве пад Масквой.

Пачынаючы з 1969 года, кожны раз у лютым месяцы праводзіцца мемарыял памяці абаронцау Ленінграда — комплексная эстафета па ваенна-прыкладных відах спорту. Масавымі сталі стралковыя спаборніцтвы.

Камітэты ВЛКСМ і ДТСААФ, спартыуны клуб вялікую увагу удзялялі правядзенню ваенна-спартыунага турніру камсамольскага актыву, агляду абаронна-масавай і спартыуна-масавай работы факультэтау, экзамену камсамольцау па фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоуцы, здачы кожным камсамольцам універсітэта нарматывау ваеннага комплексу ГАР.

Камітэтам ВЛКСМ аб'яулен агляд факультэтау і устаноулен пераходны кубак «За масавасць у спартыунай і абаронна-масавай рабоце».

Многа увагі удзяляецца нагляднай агітацыі: арганізуюцца фотавыстаукі і стэнды, ствараюцца гурткі і музеі баявой і працоунай славы, гісторыі універсітэта і факультэтау. Спецыяльныя нумары насценных газет прысвячаюцца знамянальным датам у гісторыі Савецкіх Узброеных Сіл.

Вялікую работу па прапагандзе мэт і задач героіка-патрыятычнага выхавання праводзіць рэдакцыя шматтыражнай газеты «Ленінградскі універсітэт». Пад рубрыкай «Дарогамі славы», «Паход па ленінскіх месцах» публікуецца многа матэрыялау аб рабоце штаба паходау і савета ветэранау, аб справах факультэцкіх штабау.

Вялікі уклад у патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі уносіць і калектыу бібліятэкі.

Рэгулярна ва універсітэце дэманструюцца фільмы па ваенна-патрыятычнай тэматыцы, арганізуецца здымка аматарскіх кінафільмау і паказ іх студэнцкай моладзі. Зняты да юбілею універсітэта аматарскі кінафільм «Дастойныя Айчыны» ужо прагледзелі больш 6000 студэнтау універсітэта. Вялікае выхавучае значэнне маюць масавыя мерапрыемствы: тэматычныя вечары, масавыя выезды на месцы баёу, правядзенне мітынгау.

Разнастайная работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню праводзіцца у Ленінградскім вышэйшым артылерыйскім вучылішчы імя Чырвонага Кастрычніка. У гэтай рабоце актыуна удзельнічаюць ветэраны вучылішча. Яны прымаюць удзел у выданні кніг па гісторыі вучылішча, брашур аб Героях Савецкага Саюза — выхаванцах вучылішча пад назвай «З адной баявой сям'і», а таксама зборніка «Мінулае і сучаснае вучылішча», складзенага па матэрыялах, апублікаваных у розных газетах краіны. Не абышлося без удзелу ветэранау стварэнне гістарычнага музея вучылішча. Ветэраны праводзяць гутаркі з курсантамі аб баявых традыцыях Савецкіх Узброеных Сіл, выступаюць у час прыёму курсантамі ваеннай прысягі, праводзяць даклады і гутаркі.

Практыка і вопыт саветау ветэранау паказвае, што гэтая грамадская арганізацыя, якая праводзіць важную, шматгранную работу па патрыятычнаму выхаванню моладзі, поунасцю сябе апраўдала і з поспехам можа быць выкарыстана ва умовах нашага універсітэта.

**І. МАРЧАНКА,**
**намеснік начальніка**
**ваеннай кафедры**

## АКЦЁРЫ І РОЛІ

**На мінулым тыдні студэнты факультэта журналістыкі сустрэліся з народнымі артыстамі БССР Аляксандрай Іванаунай Клімавай і Яугенам Максімавічам Палосіным. Прозвішчы гэтых таленавітых акцёрау рускага драматычнага тэатра імя А. М. Горкага ведаюць многія паклоннікі тэатра. Асабліва многа іх сярод студэнтау. Гэтая акалічнасць спрыяла таму, што сустрэча была вельмі цёплай і сардэчнай.**

**А. І. Клімава і Я. М. Палосін расказалі аб тым, як сталі акцёрамі, як працуюць над ролямі, і асабліва многа — пра любімыя вобразы, створаныя на сцэне тэатра.**

**— У мяне многа любімых вобразау. Гэта і Надзея Разаева з «Барабаншчыцы», і Валька з «Іркуцкай гісторыі» і шмат іншых. Ва усякай ролі я імкнуся знайсці тое, што мне асабліва блізка. Так, з апошніх маіх работ я асабліва люблю Гелену з «Варшаускай мелодыі». Пастаянства, вернасць, шчырасць, уменне пранесці гэтыя пачуцці праз усё жыццё — такое, на маю думку, уласціва нашым рускім жанчынам. І таму мне хацелася, каб маю Гелену гледачы палюбілі таксама, як я,— так гаварыла Аляксандра Іванауна.**

**Расказваючы пра сваіх герояу, Яуген Максімавіч Палосін зазначыў, што яркія вобразы людзей з народа, са сцвярджэннем сваёй годнасці, яму удаюцца дзякуючы назіранню за жыццём.**

**— Кожны мастак павінен быць як мага бліжэй да людзей. Толькі сярод народа ён можа знайсці тыя каштоунейшыя крупіцы, з якіх можна стварыць найбольш тыповы вобраз. Такі акцёр заусёды атрымае прызнанне. Глядач будзе удзячны яму, — сказау Я. М. Палосін.**

**Шмат гаварылі артысты і студэнты аб новых пастаноуках тэатра і вырашылі, што падобныя сустрэчы трэба праводзіць як можна часцей, бо яны вельмі карысныя і для моладзі, і для саміх акцёрау.**

**Л. БЫСТРОВА.**

## ПАСВЯЧЭННЕ З УСМЕШКАЙ

Камітэт камсамола нагадвау скалу у бушуючым прыбоі. З гулам прыбягалі камсоргі і патрабавалі аднаго — білетау. А Міша Стагаловіч, стомлена адбіваючыся, паутарау адну і тую ж фразу: «Ды няма білетау! Няма!» У кутку рэпеціравалі песню. Група дзяучат не магла вырашыць, каго пасадзіць на першы рад: першакурснікау ці каманды КВЗ. Свята «Дні матэматычнага факультэта» толькі пачалося.

У 8 універсітэтау краіны былі пасланы запрашэнні. Ужо прыехалі дэлегацыі з Гомеля і Вільнюса. Ленінградцы далі тэлеграму: сустракайце.

Задумана было смела: сустрэчы з цікавымі людзьмі, паход агітбрыгады, паездка у Хатынь, вечар-пасвячэнне. Але многія планы членау камітэта так і засталіся планамі. Прычын гэтаму многа: тут і пасіунасць рабят, і не па-вясенняму халоднае надвор'е і нявопытнасць арганізатарау.

Асновай праграмы павінен быу стаць вечар пасвячэння у студэнты. «Мы хацелі адысці ад традыцыйнага пасвячэння, дзе студэнт звычайна паказваецца са сваімі абыякавымі адносінамі да вучобы, са шпаргалкамі і бязмежна дасціпным, — прызналіся пасля у камітэце камсамола. — Мы хацелі, каб ва усёй гэтай цырымоніі было нешта магічнае...»



Залу клуба імя Дзяржынскага запоунілі па-святочнаму адзетыя матэматыкі. Ва усіх прадчуванне нечага незвычайнага. І яно апраудана: пасвячэнне у студэнты, КВЗ, танцы...

Вясёлая пара вядучых растлумачыла прысутным, што першакурснік яшчэ студэнт напалавіну, і расказала аб цяжкім лесе іх папярэднікау — вялікіх вучоных. А пасля у зале загрымеу бас: «Калі ты слабы, бяжы адсюль, пакуль не позна. Калі ж ты упэунен у тым, што зможаш усё жыццё аддаць матэматыцы, устань і вымаві словы нашай клятвы...»

Жартаулівы тон вельмі спадабауся прысутным. А калі вядучыя запатрабавалі паутарыць за імі словы клятвы — тут іх спасцігла няудача: першакурснікі думалі, што з імі усё яшчэ жартуюць. І толькі пачуушы свяшчэннае слова «дэканат», не замарудзілі крыкнуць: «Клянёмся!»

Пасля пачаліся віншаванні. Вясёлы пяцікурснік пабацькоуску раіу нічога не баяцца, весяліцца, пакуль маладыя.

Ад гасцей з іншых універсітэтау чакалі цікавых расказау, але, будучы сапраpraуднымі матэматыкамі, яны прамовілі шэсць фраз на траіх, павіншавалі з «хрышчэннем» і пажадалі поспехау у навуковай рабоце.

На гэтым пасвячэнне закончылася, а месца вядучых занялі кэвээншчыкі, студэнты II курса.

Тут ужо першакурснікау праінструктавалі па усіх цікавячых іх пытаннях. Яны атрымалі мудрыя парады людзей з гадавым стажам у пытаннях шлюбу, рэкамендацыі, як здаваць залікі і экзамены, сваімі вачыма убачылі, як «два матэматыкі-выдатнікі замяняюць экскаватар» і г. д.

Так, вечар быу нядрэнны. «Гэта лепшае, што калі-небудзь наладжвалася на матфаку»,—гавораць у камітэце камсамола. Але асноунай мэты ён не дасягнуу.

Ці было яно, пасвячэнне, ці быу хвалюючы расказ аб любімай справе? Сур'ёзная размова заблудзілася сярод жартау і смеху.

**Т. СУРТАЕВА, Л. СПІВАК,**
**студэнткі.**

## ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ, СЯБРЫ!

Днямі у рэдакцыю «Беларускага універсітэта» прыйшло пісьмо ад вучняу Аталезскай сярэдняй школы Мінскага раёна. У пісьме рабяты выказваюць шчырую падзяку сваім шэфам, студэнтам фізічнага факультэта БДУ, якія нядаўна пабывалі у іх у гасцях. Вось што пішуць школьнікі: «Старшакласнікі сардэчна дзякуюць сваім шэфам за бібліятэчку кніг, якія з задавальненнем чытаем.

Паважаныя шэфы, чакаем вас да сябе у госці, чакаем вашых расказау аб старэйшай навучальнай установе рэспублікі, аб яе факультэтах. Яшчэ раз дзякуем за кнігі. Прыязджайце!

Старшакласнікі Аталезскай сярэдняй школы».

Такія сустрэчы студэнтау-фізікау са сваімі малодшымі сябрамі з падшэфных школ адбываюцца даволі часта. Ніжэй мы расказваем аб адной з іх.

* * *

*...Зала чакала. Толькі лёгкі шэпт парушау цішыню. У апошні раз Саша Паулай праглядвау даклад, прысвечаны юбілею У. І. Леніна. Коля Варабей удакладняу парадак выступленняу сваіх аднакурснікау, цяпер самадзейных артыстау.*

*Прачытан даклад. Адзін за другім на сцэну выходзяць фізікі. Спявае песні Валодзя Ражкоу. У яго атрымалася своеасаблівая размова з рабятамі: ён расказау падрабязна пра тыя песні, якія спявау, трымауся на сцэне проста, свабодна. Было відавочна, што выступае Валодзя не упершыню. Гэта і дапамагло яму устанавіць адразу ж цесны кантакт са слухачамі. Апошнія шчыра узнагароджвалі яго за добрыя песні апладысментамі. Цёпла сустрэлі школьнікі і выступленне Валеры Карнейчука, хоць ён упершыню спявау са сцэны. Спадабаліся ім і інсцэніроукі у выкананні Мікалая Собалева, Дзімы Шукаева, Міхася Кірыёнка. Добра прачытала вершы Ларыса Семянікіна.*

*Калі канцэрт закончыуся, дырэктар школы шчыра падзякавау студэнтам.*

* * *

*Учора гасцямі фізікаў былі старшакласнікі з падшэфных сельскіх і мінскіх школ. Цэлы дзень рабяты правялі ва універсітэце. Студэнты расказвалі ім аб сваёй вучобе, факультэце. А пасля абеду, аб якім не забылі гаспадары, гасцям паказалі вялікі канцэрт.*

*С. БАБІЧАВА.*

## СПОРТ

## ВЫЗНАЧАНЫ МАЦНЕЙШЫЯ

Каля месяца праходзіла першынство універсітэта па баскетболу у праграме круглагадавой спартакіяды, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У спаборніцтвах прынялі удзел 153 спартсмены — прадстаунікі 9 факультэтау, за выключэннем жаночай каманды юрфака. Спаборніцтвы абслугоувала судзейская брыгада з ліку студэнтау, якія уваходзяць у зборныя каманды універсітэта. Лепшымі арбітрамі можна назваць А. Малышава (фізфак), М. Зарэцкага (матфак), А. Сельскага (біяфак), В. Кандратовіча, В. Яушэнку (хімфак), Л. Ханкевіча (гістфак). Добра выконвалі абавязкі сакратароу В. Гулідзіна (матфак), Г. Галкіна і Р. Апановіч (філфак).

Калі сярод жанчын барацьба вялася паміж трыма камандамі (геафак, фізфак, гістфак), члены якіх складаюць асноуны касцяк жаночай зборнай каманды універсітэта, то адсутнасць двухкратнага чэмпіёна спартакіяды — мужчынскай каманды мясцовага камітэта паказала поуную перавагу каманды фізфака.

Барацьбу за прызавыя месцы у мужчын вялі 4 каманды: матфака, гістфака, юрфака і хімфака. Астатнія каманды па класу гульні намнога ад іх адставалі.

У выніку упартых паядынкау месцы у жаночым турніры размеркаваліся у наступным парадку: геафак, фізфак, гістфак, матфак, хімфак, філафак, журфак, біяфак. У мужчын: фізфак, матфак, гістфак, юрфак, хімфак, біяфак, філфак, геафак, журфак.

Лепшымі ігракамі прайшоўшых спаборніцтвау былі сярод жанчын Л. Жабінская, Л. Хілько, Л. Ярмольчык (геафак), Т. Кабанава, З. Патапава, Л. Псікава (фізфак), Р. Чыпайтэ (гістфак), Л. Сняжкова (хімфак). Сярод мужчын — А. Малышау, А. Янушэускі, А. Сакольскі, І. Мельнічэнка, В. Мачальскі (фізфак), М. Зарэцкі, М. Талочка, В. Цяслюк (матфак), Г. Харэвіч, Л. Ханкевіч, В. Ціток (гістфак).

Побач са станоучымі бакамі прайшоўшых гульняу трэба адзначыць факты безадказных адносін. Так, нясвоечасова была пададзена заяўка на удзел у спаборніцтвах камандамі гістарычнага факультэта. Форма іх таксама не адпавядала правілам у першых гульнях турніру. Майкі без адпаведных нумароў былі у мужчынскіх каманд юрфака, біяфака. Неэтычна вёу сябе капітан мужчынскай каманды журфака, які у час пройгрышу камандзе філфака, калі да канца матча заставалася 3 секунды, дэманстратыўна настройвау усю каманду пакінуць пляцоўку. Сапраўдны спартсмен павінен умець не толькі належным чынам успрымаць перамогі, але і дастойна пераносіць горыч паражэнняу.

**Г. ГРУДО,**
**галоўны суддзя спаборніцтвау, ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**



*На здымку: ідуць занягкі у секцыі барцоў. Кіруе імі Віктар Васільевіч Рудэнкаў.*

## На апошняй лыжні

У Ганалесе было праведзена першынство універсітэта па лыжнаму спорту. Надвор'е было самым неспрыяльным. Тэмпература паветра + 5. Улічваючы цяжкія умовы, прыйшлося замяніць дыстанцыю для мужчын з 15 км на 10.

У выніку напружанай барацьбы першае месца заняу студэнт III курса Уладзімір Сыцько. Поспех яго не выпадковы. Валодзя ужо два гады з'яуляецца прызёрам першынства рэспублікі сярод вну па біятлону. Другое месца заняу студэнт III курса хімфака Аляксандр Струновіч, таксама член зборнай універсітэта па біятлону. Пераможцай у жанчын стала Святлана Альцэуская (V курс біяфака).

У гэты ж дзень былі праведзены эстафеты. Пераможцамі як у жанчын, так і у мужчын сталі студэнты хімфака.

На другі дзень надвор'е таксама не змянілася, але спаборніцтва працягвалася. Пераможцам на дыстанцыі 10 км стау студэнт IV курса хімфака Анатоль Паулау, другое месца заняу Аляксандр Струновіч, трэцяе — Канстанцін Лапо, таксама студэнт хімічнага факультэта.

У жанчын на дыстанцыі 3 км пераможцай стала студэнтка хімфака Н. Івашкевіч, другое месца заняла Т. Мяснікевіч (філфак), трэцяе — Н. Целяпнёва (філфак).

Камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: I — хімфак, II — біяфак, III — філфак, IV — журфак, V матфак, VI — фізфак, VII — гістфак, VIII — геафак, IX — юрфак.

**Л. КАПЫЛОВА,**
**галоуны суддзя спаборніцтвау, майстар спорту.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА

Згублены студэнцкі білет № 652269, выдадзены на імя студэнткі геафака СКАРЫНКІНАЙ Тамары Іванауны, лічыць несапраудным.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. № 483. АТ 21510